**Дадатак 1**

## Статут літаратурнага аб’яднання «Жывіца»

### I. Агульныя палажэнні

1. Літаратурнае аб’яднанне «Жывіца» – добраахвотная незалежная садружнасць вучняў 5 – 11 класаў Сакалоўскай сярэдняй школы.

2. Дзейнасць літаратурнага аб’яднання мае культурна-асветніцкі характар і заснавана на выданні школьнага літаратурнага часопіса «Жывіца».

3. У сваёй дзейнасці літаратурнае аб’яднанне «Жывіца» кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, статутам ДУА «Сакалоўская сярэдняя школа», дадзеным статутам, загадамі дырэктара школы.

### II. Кіраўніцтва

1. Літаратурнае аб’яднанне ўзначальвае кіраўнік, які назначаецца і вызваляецца ад пасады на агульным сходзе членаў літаратурнага аб’яднання шляхам адкрытага галасавання.

2. Кіраўнік літаратурнага аб’яднання павінен мець вышэйшую педагагічную адукацыю (настаўнік беларускай мовы і літаратуры).

### III. Структура літаратурнага аб’яднання

1. Літаратурнае аб’яднанне мае ў сваёй структуры наступныя падраздзяленні:

1. 1. рэдакцыя школьнага літаратурнага часопіса «Жывіца»;

1. 2. інтэрнэт-сайт часопіса «Жывіца» givitca.com;

1. 3. драматычны гурток «Сакалоўскія зорачкі»;

1. 4. навуковае таварыства «Маладзік».

2. Кожны з членаў літаратурнага аб’яднання можа ўдзельнічаць у рабоце вышэйназваных падраздзяленняў.

### IV. Правы і абавязкі членаў літаратурнага аб’яднання

1. Членамі літаратурнага аб’яднання могуць быць вучні 5–11 класаў, якія выказалі жаданне працаваць у аб’яднанні, займацца літаратурнай і навуковай дзейнасцю.

2. Прыём у члены літаратурнага аб’яднання ажыццяўляецца кіраўніком на аснове пісьмовай заявы.

3. Выхад з членаў літаратурнага аб’яднання ажыццяўляецца шляхам падачы заявы кіраўніку.

4. Выключэнне з членаў літаратурнага аб’яднання ажыццяўляецца па рашэнні сяброў літаратурнага аб’яднання ў наступных выпадках:

4. 1. парушэнне статута літаратурнага аб’яднання;

4. 2. адмова без уважлівых прычын удзельнічаць у падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў літаратурнага аб’яднання;

4. 3. дзейнасць, якая пярэчыць мэтам і задачам літаратурнага аб’яднання;

4. 4. дзейнасць, якая наносіць маральную і матэрыяльную шкоду літаратурнаму аб’яднанню;

4. 5. невыкананне членам літаратурнага аб’яднання службовых або іншых абавязкаў, ускладзеных на яго кіраўнікам літаратурнага аб’яднання.

5. Члены літаратурнага аб’яднання абавязаны:

5. 1. актыўна ўдзельнічаць у мерапрыемствах, якія праводзяцца ў школе літаратурным аб’яднаннем «Жывіца»;

5. 2. удзельнічаць у прапагандзе беларускай мовы, літаратуры і культуры.

6. За актыўную работу ў літаратурным аб’яднанні, за дасягнутыя творчыя поспехі члены аб’яднання могуць быць узнагароджаны граматамі.

**Дадатак 2**

**Палажэнне аб дзейнасці школьнага навуковага таварыства «Маладзік»**

Школьнае навуковае таварыства «Маладзік» – структурнае падраздзяленне літаратурнага аб’яднання «Жывіца». «Маладзік» – гэта добраахвотнае творчае аб’яднанне вучняў Сакалоўскай сярэдняй школы, якія імкнуцца ўдасканальваць свае веды ў галіне беларускай філалогіі, развіваць свой інтэлект, выпрацоўваць уменні і навыкі навукова-даследчай дзейнасці.

**Задачы таварыства**

1. Раскрыццё інтарэсаў і захапленняў вучняў падчас навукова-пошукавай дзейнасці.
2. Прафесійная арыентацыя вучняў.
3. Падрыхтоўка членаў таварыства да самастойнай даследчай дзейнасці.
4. Распрацоўка і рэалізацыя даследчых праектаў.
5. Прапаганда дасягненняў беларускай філалагічнай навукі.

**Змест і формы работы**

1. Правядзенне семінараў, дыскусій, навукова-практычных канферэнцый.
2. Удзел у алімпіядах і конкурсах.
3. Пасяджэнні членаў школьнага навуковага таварыства.
4. Распрацоўка і рэалізацыя навукова-даследчых праектаў.
5. Выданне зборніка навуковых прац «Малады даследчык».

**Членства ў таварыстве**

1. Удзельнічаць у рабоце навуковага таварыства «Маладзік» могуць вучні 5–11 класаў.
2. Членамі навуковага таварыства з’яўляюцца вучні, якія пастаянна займаюцца навукова-даследчай дзейнасцю ў галіне беларускай філалогіі, актыўна ўдзельнічаюць у рэалізацыі праектаў навуковага таварыства.

**Правы і абавязкі членаў таварыства**

1. Члены навуковага таварыства «Маладзік» маюць права:
- выкарыстоўваць матэрыяльную базу таварыства для самастойных даследаванняў;

- атрымліваць кансультацыі і рэцэнзіі на свае работы, мець навуковага кіраўніка, друкаваць свае работы на старонках школьнага літаратурнага часопіса «Жывіца», зборніка «Малады даследчык»;
- прымаць удзел у школьных, раённых, абласных, рэспубліканскіх турах конкурсаў і алімпіяд;
- выбіраць і быць выбранымі ў кіруючыя органы навуковага таварыства.

2. Члены навуковага таварыства абавязаны:

- актыўна працаваць у адной ці некалькіх групах;
- удзельнічаць у рабоце навукова-практычных канферэнцый;
- самастойна паглыбляць веды па выбранай галіне навукі.

3. За актыўную работу ў навуковым таварystве і дасягнутыя творчыя поспехі члены таварыства могуць быць узнагароджаны граматамі. Лепшыя дасягненні членаў таварыства могуць быць рэкамендаваны для ўдзелу ў раённых канферэнцыях, для публікацый у зборніках навукова-даследчых прац.

**Дадатак 3**

**Анкета**

**Паважаны рэспандэнт!**

**З мэтай арганізацыі прадуктыўнай работы школьнага літаратурнага часопіса «Жывіца» просім вас адказаць на наступныя пытанні**

1. Для пачатку, давайце з вамі пазнаёмімся ……………………………………..

(калі не хочаце, можаце не ўказваць сваё імя)

2. Ваш пол: **М** **Ж** і ўзрост ……………………………………………………..

3. Вы чыталі школьны літаратурны часопіс «Жывіца»? ………………………..

4. Вашы адносіны да выдання часопіса «Жывіца» …………………………….....

………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………

5. Якія раздзелы часопіса вам найбольш спадабаліся? (патрэбнае падкрэсліць)

- Проза аўтараў «Жывіцы».
- Магілёўшчына літаратурная.
- Пісьменнікі-юбіляры.
- Нашы паэтычныя спробы.
- Майстэрня паэта.
- Колькі талентаў звялося.
- Адпачываем з «Жывіцай».

6. Якімі б раздзеламі вы хацелі дапоўніць змест часопіса?

………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………

7. Як зрабіць літаратурны часопіс папулярным?

………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………

**Дзякуем вам за тое, што знайшлі час і магчымасць адказаць на пытанні нашай анкеты. Дадзеныя анкетавання дапамогуць у далейшай рабоце школьнага літаратурнага часопіса «Жывіца».**